Паэтычныя тэксты Сімяона Полацкага аказаліся больш жыццяздольнымі. Амаль палова іх (61 прыклад) увайшла ў шырокі ўжытак.

Гэтым абвяргаецца шэраг негатыўных выказванняў аб паэтычным стылі Сімяона Полацкага (напрыклад, Н.Д.Фіндэйзена і А.В.Пазднеева) і даказваецца, што вершы ўраджэнца з Беларусі былі папулярнымі ў асяродку шырокіх мас.

1. Удакладненыя звесткі аб асобе Сімяона Полацкага мы прыводзім па кнігах Л.І.Сазонавай (*Сазонова Л.И.* Поэзия русского барокко. — М., 1991. — С. 14) і Ул.Арлова (*Орлов В.* Тайны полоцкой истории. — Мн., 1995).

*2. Гай дэ Пікарда.* Царкоўная музыка ў Беларусі. — Мн., 1995. — С. 28.

3. ДГМ — Дзяржаўны гістарычны музей (г. Масква).

4. Знаходзіцца ў РАН — Расійская акадэмія навук.

5. Пакуль што яго выявіць не ўдалося.

*6. Пушкарёв Л.В.* Симеон Полоцкий. Русские писатели XVII века. — М., 1972. — С. 269.

7. РНБ — Расійская нацыянальная бібліятэка (г. Санкт-Пецярбург); Сал. — Збор Салавецкага манастыра.

8. РДБ — Расійская дзяржаўная бібліятэка (г. Масква).

9. Арх. кам. — Збор археалагічнай камісіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**І.А. Смірнова,**
*суіскальнік кафедры беларускай*
*і сусветнай мастацкай культуры*

## З ГІСТОРЫІ РАЗВІЦЦЯ ФАРТЭПІЯННАГА ВЫКАНАННЯ (першая палова XX ст.)

З'яўляючыся неад'емнай часткай мастацкай культуры, беларускае фартэпіяннае выкананне прайшло складаны, супярэчлівы, але плённы шлях развіцця, дасягнуўшы найвышэйшага росквіту ў другой палове XX ст. Некалькі

пакаленняў выдатнейшых артыстаў і педагогаў праславілі нашу Радзіму ў гэтай сферы.

На сучасным этапе прафесійнае фартэпіяннае мастацтва — гэта значная частка музычнай культуры. Бліскучыя поспехі беларускіх піяністаў на прэстыжных міжнародных конкурсах у розных краінах свету (Францыя, Германія, Галандыя, Бельгія, ЗША, Італія, Літва, Латвія, Расія, Польшча і інш.) сведчаць аб наяўнасці выдатнай прафесійнай піяністычнай школы Беларусі, яе нацыянальных асаблівасцях і традыцыях.

Не так даўно існавала думка, што "Паўночна-Заходні край, у які ўваходзіла Беларусь, заставаўся музычнай пустыняй з чахлымі аазісамі аж да Кастрычніцкай рэвалюцыі". Сёння памылковасць гэтага погляду відавочная. Дзякуючы беларускім даследчыкам-музыкантам (А.Ахвердава, В.Дадыёмава, І.Назіна, В.Масленікава і інш.), можна ўпэўнена сказаць, што жыццё нашых папярэднікаў было духоўна багатым і насычаным, што перадумовы фарміравання сучаснай беларускай фартэпіяннай школы ўзніклі яшчэ ў XIX ст., калі ў Беларусі з'явіліся першыя прафесійныя піяністы і фартэпіянны рэпертуар.

Разам з тым трэба прызнаць, што развіццё нацыянальнага музычнага мастацтва, у тым ліку фартэпіяннага, набыло бесперапынны і мэтанакіраваны характар толькі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі і стварэння БССР. Менавіта ў гэты час працэс фарміравання музычнай адукацыі атрымлівае пэўную функцыянальную накіраванасць. Упершыню ў гісторыі Беларусі адкрываюцца музычныя навучальныя ўстановы (народныя кансерваторыі, школы, тэхнікумы), робяцца спробы стварыць цэласную сістэму музычнага выхавання з мэтай падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў.

Багацейшае гісторыка-культурнае мінулае беларускага народа і змяненне грамадска-палітычнага ладу садзейнічалі далейшаму станаўленню прафесійнага фартэпіяннага выканання.

Вядома, што тэрыторыя сучаснай Беларусі ўваходзіла ў састаў розных дзяржаўных фарміраванняў — Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расіі. У Беларусі адбываліся працэсы асіміляцыі і сінтэзу лепшых культурных дасягненняў. Станаўленне і эвалюцыя беларускай культуры адбываліся ва ўзаемадзеянні з іншымі культурамі — заходняй і ўсходняй. Менавіта сінтэз гэтых культур з'явіўся фактарам, які вызначыў набыццё пэўных якасцей беларускім нацыянальным мастацтвам.

Сувязь з рускай піяністычнай школай праявілася ў першай палове XX ст. перш за ўсё ў жывой, непасрэднай пераемнасці выканальніцкіх традыцый. Ля вытокаў беларускай фартэпіяннай культуры стаялі таленавітыя, высокапрафесійныя музыканты, якія прыехалі ў Беларусь галоўным чынам з Расіі. Яны сталі звязуючым звяном паміж гістарычна ўстойлівымі традыцыямі рускай фартэпіяннай культуры і новым выканальніцкім мастацтвам Беларусі.

У рэспубліцы ўжо ў дваццатыя гады склалася асяроддзе таленавітых настаўнікаў (у дзіцячых музычных школах, галоўным чынам, у Мінску, Віцебску, Гомелі, Магілёве). У Віцебску вылучаліся два майстры пачатковага музычнага навучання — Е.Р.Шуман і А.Ф.Штэйн. Абодва — выдатныя музыканты, якія вучыліся ў Пецярбургскай кансерваторыі яшчэ пры жыцці А.Рубінштэйна і плённа працавалі на працягу ўсяго свайго жыцця. У класе Е.Р.Шуман выхоўваўся вядомы беларускі кампазітар і грамадскі дзеяч, адзін са стваральнікаў нацыянальнай беларускай кампазітарскай школы, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР і Дзяржаўнай прэміі СССР, народны артыст БССР, прафесар А.Багатыроў.

Важнае значэнне для развіцця прафесійнага выканання ў Беларусі мела адкрыццё ў Мінску ў 1924 г. музычнага тэхнікума. На аддзяленні фартэпіяна там працавалі знакамітыя педагогі — піяністы В.Сямашка, Г.Пятроў, Р.Маўшовіч, Г.Бах, Я.Жыў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В.І.Сямашка нарадзілася ў Беларусі, атрымала музычную адукацыю ў Маскоўскай кансерваторыі ў класах прафесараў Н.Кашкіна і В.Сафонава. Яе творчая дзейнасць фарміравалася пад непасрэдным уплывам творчасці С.Рахманінава, А.Скрабіна, І.Левіна, П.Чайкоўскага, А.Чэхава, А.Гальдэнвейзера, К.Ігумнава і інш. Выхаванка В.Сафонава, В.Сямашка была яго паслядоўніцай. У яе класе выхоўваліся народны артыст БССР С.Талкачоў, дацэнты Маскоўскай кансерваторыі Г.Дзінор і Л.Левіна, заслужаны работнік вышэйшай школы БССР, прафесар Беларускай кансерваторыі І.Цвятаева і інш.

Г.М.Пятроў фундаментальную музычную адукацыю атрымаў у Маскоўскай кансерваторыі, якую закончыў з сярэбраным медалём у 1910 г. па класе выдатнага рускага піяніста К.Ігумнава. З 1923 г. і да канца свайго жыцця ён быў трывала звязаны з беларускім музычным мастацтвам. Г.Пятроў актыўна спалучаў педагагічную, выканальніцкую і грамадскую дзейнасць. У 1933 г., калі быў створаны Дзяржаўны тэатр оперы і балета, Г.Пятроў займаў пасады дырыжора сімфанічнага аркестра, хормайстра і канцэртмайстра. Ён быў першым прарэктарам Белдзяржкансерваторыі, узначальваў кафедру агульнага фартэпіяна, працаваў у сярэдняй спецыяльнай школе пры кансерваторыі, даваў шмат канцэртаў у якасці саліста ў гарадах Расіі, Германіі, Італіі. Г.Пятроў атрымаў званне заслужанага дзеяча мастацтваў і двойчы быў узнагароджаны ордэнам “Знак Пашаны”.

Знамянальнай падзеяй у развіцці беларускага нацыянальнага музычнага мастацтва з’явілася адкрыццё ў Мінску ў 1932 г. Белдзяржкансерваторыі. Кафедра спецыяльнага фартэпіяна была сфарміравана на базе фартэпіяннага аддзялення Мінскага музычнага тэхнікума. На кафедры пачалі працаваць В.Сямашка, Я.Жыў, М.Асрыеў, Я.Зільберберг.

Я.Ул.Зільберберг-Скупнік вучылася ў кансерваторыі ў Пецярбургу (клас прафесара А.Есіпавай) і Вене (клас Т.Лешаціцкага), удасканальвала свае веды ў Л.Гадоўскага.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пад уплывам гэтых славутых піяністаў складвалася яе выканальніцкая і педагагічная дзейнасць. У 1942 г. Я.Ул.Зільберберг атрымала званне заслужанага дзеяча мастацтваў БССР. Яна выхавала шэраг таленавітых піяністаў, сярод якіх кампазітар М.Вайнберг і прафесар В.Рахленка.

М.Асрыеў скончыў Тбіліскую кансерваторыю, а потым аспірантуру. Займаўся ў прафесара М.Юдзінай і ў Л.Трусоўскага. З 1935 г. па 1937 г. узначальваў кафедру спецыяльнага фартэпіяна. Вельмі таленавіты і шырока эрудзіраваны, М.Асрыеў актыўна спалучаў педагагічную работу з арганізацыйнай. Займаўся музычна-крытычнай дзейнасцю, чытаў публічныя лекцыі па пытаннях мастацтва і музыказнаўства, быў ініцыятарам і арганізатарам выкладання курсаў гісторыі і тэорыі музыкі ў кансерваторыі.

У 1937 г. пасля заканчэння аспірантуры з Масквы ў Мінск прыязджае А.Клумаў, вучань прафесара Г.Нейгаўза (клас фартэпіяна) і прафесара М.Гнесіна (клас кампазіцыі). Яркая, таленавітая асоба, універсальны музыкант А.Клумаў адыграў значную ролю ў развіцці беларускага музычнага мастацтва. З 1937 г. ён узначальваў кафедру спецыяльнага фартэпіяна, актыўна канцэртаваў амаль ва ўсіх буйнейшых гарадах Беларусі, выступаў з лекцыямі для выкладчыкаў музычных вучылішч і дзіцячых музычных школ, вывучаў беларускі фальклор. А.Клумаў справядліва лічыцца заснавальнікам нацыянальнага фартэпіяннага рэпертуару. Яго фартэпіянныя творы ўвайшлі ў залаты фонд беларускай музыкі і да гэтага часу карыстаюцца папулярнасцю. За паспяховы ўдзел у Першай дэкадзе беларускага мастацтва і літаратуры ў Маскве (1940) А.Клумаў атрымаў званне заслужанага дзеяча мастацтваў БССР.

Прафесійнаму росту кафедры садзейнічаў прыезд у Мінск маладых таленавітых педагогаў М.Бергера і Г.Шаршэўскага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

М.А.Бергер, ураджэнец Беларусі, першы выпускнік Мінскага музычнага тэхнікума (клас Я.Жыва), атрымаў вышэйшую адукацыю ў Пецярбургскай кансерваторыі (клас прафесараў В.Калантаравай і Л.Нікалаева). Творчае жыццё М.Бергера выходзіла далёка за межы працы на кафедры спецыяльнага фартэпіяна. З 1933 г. па 1935 г. ён працаваў салістам Мінскай філармоніі і на радыё, з 1938 г. па 1941 г. — рэктарам Белдзяржкансерваторыі, узначальваў кафедру канцэртмайстарскага майстэрства, быў ініцыятарам і актыўным удзельнікам Першай франтавой канцэртнай брыгады, адначасова з'яўляўся палымяным прапагандыстам беларускага фартэпіяннага і камернага мастацтваў. М.Бергер — аўтар шэрага твораў для фартэпіяна, якія атрымалі распаўсюджанне ў педагагічным рэпертуары. У яго класе скончылі кансерваторыю больш за 100 чалавек, сярод якіх прафесары гэтай установы Л.Шаламенцава і Л.Юшкевіч, дацэнты А.Тэр-Мінасян і С.Оськіна, народны артыст БССР, кампазітар Ул.Алоўнікаў і інш. За актыўны ўдзел у Першай дэкадзе беларускага мастацтва і літаратуры ў Маскве (1940) М.Бергер атрымаў званне "Заслужаны артыст БССР".

У фарміраванні і развіцці фартэпіяннай школы Беларусі выключна вялікае значэнне мае педагагічная дзейнасць Г.І.Шаршэўскага.

Г.Шаршэўскі атрымаў фундаментальную адукацыю ў Пецярбургскай кансерваторыі (клас прафесара С.Саўшынскага) і ў аспірантуры (клас прафесара Ул.Сафраніцкага). Самааддана і плённа працаваў ён на працягу ўсяго жыцця, выхаваў больш за 90 піяністаў. У цесных творчых адносінах з майстрам і пад яго непасрэдным уплывам фарміраваўся прафесіяналізм многіх выкладчыкаў і выканаўцаў. Сярод вучняў Г.Шаршэўскага лаўрэат Міжнароднага конкурсу імя П.І.Чайкоўскага Э.Міянсараў, лаўрэаты міжнародных, міжрэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсаў Л.Талкачова, А.Рабіновіч, Б.Спектар, А.Ліўшыц, Е.Брэгман, В.Дулаў, А.Кузняцова, заслужаная артыстка БССР І.Шуміліна, народны артыст

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

СССР І.Лучанок, народны артыст БССР Г.Вагнер, кампазітар Э.Тырманд, заслужаны настаўнік БССР Л.Ліхачэўская, прафесар Беларускай акадэміі музыкі В.Рахленка, заслужаная артыстка БССР Л.Максімава і інш. Г.Шаршэўскі выхаваў цэлую плеяду паслядоўнікаў, якія працягваюць яго справу выхавання новага пакалення піяністаў. Педагагічная дзейнасць Г.Шаршэўскага праходзіла ў непарыўнай сувязі з выканальніцкай. Ён актыўна канцэртаваў у якасці саліста і члена ансамбля, удзельнічаў у канцэртах на франтах Вялікай Айчыннай вайны, атрымаў званне заслужанага дзеяча мастацтваў БССР.

Вялікая любоў педагогаў да сваёй прафесіі, іх уласная канцэртная дзейнасць мелі вялікае значэнне ў фарміраванні беларускай фартэпіяннай культуры. Гэта яны, выхаванцы рускай піяністычнай школы, вучні В.Сафонава, С.Саўшынскага, К.Ігумнава, А.Есіпавай, Г.Нейгаўза, Ул.Сафраніцкага, сталі заснавальнікамі нацыянальнага беларускага фартэпіяннага выканання.

**І.Б.Тарасава,**
*суіскальнік кафедры бібліятэказнаўства*

## РОЛЯ БІБЛІЯТЭК Ў ВЫХАВАННІ ДЗЯЦЕЙ

З даўніх часоў бібліятэкі былі месцам інтэлектуальнага развіцця дзяцей. Нават у Старажытным Егіпце ішоў працэс навучання пісараў на базе тэкстаў, захаваных у бібліятэках. У нашай нацыянальнай культуры дзіцячыя бібліятэкі ўзніклі больш 100 гадоў таму як інстытут зносін, прызначаны клапаціцца аб асвеце і духоўным здароўі дзяцей.

Іменна кніга, чытанне іграюць галоўную ролю ў інтэлектуальным развіцці дзяцей. Па меркаванні вучоных, фарміраванне інтэлекту залежыць на 90 % ад чытання і толькі на 10 % ад іншых фактараў.